Шыфр:____________________

Колькасць балаў:____________

Месца:____________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

________________ В.А. Будкевіч

«13» сакавіка 2014 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Гродна, 2014 г.*

**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

### Варыянт І

**Заданне 1.** Падкрэсліце словы (спалучэнні слоў), напісанне якіх адпавядае сучасным арфаграфічным нормам.

Упішыце ў тэкст прапушчаныя словы (спалучэнні слоў).

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**І.** *Кандытар, аўдыёплэер, ток-шоу, радыебіялогія, Токіа, дэзінтэграцыя, шэсцьдзесят, фарпосны, стаградусны, андэграунд.*

**ІІ.** У 1918 г. апублікавана «________________________» Браніслава Тарашкевіча, у якой фактычна ўпершыню былі сфармуляваны асноўныя правілы беларускага правапісу. У сваёй працы Браніславу Тарашкевічу ўдалося спалучыць ______________ і ______________ прынцыпы напісання. Пры гэтым ______________ прынцыпу, паводле якога адлюстроўваюцца на пісьме асаблівасці вымаўлення, у асноўным падпарадкуецца напісанне галосных літар, а ______________, паводле якога марфемы захоўваюцца ў нязменным выглядзе незалежна ад іх вымаўлення, – напісанне зычных літар (*В. Іўчанкаў*).

**Заданне 2.** Устаўце ў сказы прапушчаныя фразеалагізмы з кампанентамі-назвамі музычных інструментаў у адпаведнасці з пазначанымі лексічнымі значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*



| Сказ | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| 1) Але, як я заўважаю, то ты, Лявон, з цесцем ______________ (*І. Грамовіч*). | *'пачаў дзейнічаць заадно'* |
| 2) Хай не забываюць, што ў канторы ўсё ж ______________ ён, дырэктар (*Л. Гаўрылкін*). | *'самая галоўная, найбольш уплывовая асоба ў якой-небудзь галіне, справе'* |
| 3) – А мне няма часу з вамі ______________ (*А. Цяжкі*). | *'займацца чым-небудзь нудным, аднастайным'* |

**Заданне 3.** Перакладзіце рэцэпт на беларускую мову, замяняючы інфінітывы дзеясловамі 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу. Лічбы запішыце словамі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Капустные конвертики**

Листья капусты отделить от кочана и сварить в подсоленной воде. Нарезать толстыми пластинами 150 г сыра. Взбить 2 яйца с солью и 7 столовыми ложками молока. Когда капустные листья станут мягкими, вынуть их из кипящей воды, срезать толстые прожилки. В каждый лист завернуть сыр, обвалять конвертик в муке. Обжарить конвертики до золотистого цвета с каждой стороны (*Энциклопедия белорусской кухни «Смачна есці»*).

**Заданне 4.** Запоўніце табліцу, падабраўшы да слоў першага слупка аднакаранёвыя, утвораныя бяссуфіксным (нульсуфіксальным) спосабам.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Бяссуфіксны (нульсуфіксальны) спосаб утварэння | |
|---|---|
| 1) разрываць – | |
| 2) шэсць – | |
| 3) нафтаперапрацоўка – | |
| 4) воўк – | |
| 5) прывольны – | |

**Заданне 5.** Прачытайце прыказку. Вызначце, які дзеяслоў у ёй мае граматычны амонім у форме прошлага часу адзіночнага ліку. Запішыце амаформы ў пачатковай форме, формах 1-ай асобы адзіночнага і множнага ліку і 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга часу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

*І мыла, і шыла, і прала, і ткала – і ўсё языком* (Прыказка).

| Пачатковая форма | Форма 1-ай асобы адзіночнага ліку | Форма 1-ай асобы множнага ліку | Форма 2-ой асобы множнага ліку |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

**Заданне 6.** Утварыце колькасна-іменныя спалучэнні і запішыце назоўнікі, што ў дужках, у неабходнай форме.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

*двух* (грош) ____________________
*тры* (чорт) ____________________
*табун* (конь) ____________________
*чатыры* (сусед) ____________________
*дваццаць* (чалавек) ____________________

**Заданне 7.** Уважліва прачытайце тэкст. Выканайце заданні, адкажыце на пытанне.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

(1) *Ліст быў і не жоўтым, і не чырвоным, а такім, як чалавечая далонь, што паружавела ад холаду.* (2) *Адсюль, з пакоя, Антон, здавалася, адчувае, як халадна і зябка гэтаму кляноваму лісту.* (3) *Невядома, адкуль прынёс яго сюды сыры вецер і панёс бы далей, ды ліст прыляпіўся да вугла шыбіны.* (4) *І цяпер здаецца, што нечая далонь адтуль, з восеньскай халадэчы, просіць літасці.*

(5) *Як хутка яна надышла – восень!* (6) *Пажоўклую і пачарнелую лістоту неяк раптоўна здзьмула з безабаронных дрэў, і агаленыя цяпер галіны сячэ дробны дождж.* (7) *Кроплі бясконца сцякаюць па шкле.* (8) *Яны, кроплі, заадно з ветрам, заадно з восенню: ім усім трэба схаваць гэты ліст, апошні напамін пра лета.*

(9) *Антон не журыцца пра лета.* (10) *Ён чакаў восені, таму што восенню пачынаюцца заняткі...* (Паводле В. Гапеева)



## ЗАДАННІ І ПЫТАННІ ДА ТЭКСТУ

1. Вызначце і запішыце стыль тэксту і тып маўлення ў ім.

____________________

____________________

2. Да якога тыпу трэба аднесці ***другі сказ*** тэксту?

____________________

____________________

3. Адзначце нумар сказа, у якім парушаны сінтаксічныя нормы. Запішыце сказ правільна.

____________________

____________________

**Заданне 8.** Пра якія творы ідзе гутарка ў наступных тэкстах? Назавіце твор і яго аўтара. Аформіце свае адказы ў табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1) У прадмове да твора аўтар піша: “Усё, што адбываецца ў п’есе, магло здарыцца ў любой капіталістычнай краіне, дзе агіднасць маралі, прыніжэнне асобы, бесперспектыўнасць заўтрашняга дня, жорсткасць і бесчалавечнасць мяшчанскага быту становяцца відавочнымі нават дзецям”.

2) Навуковец і паэт М. Арочка пра гэты твор пісаў: «Калі верш быў перасланы ў тыл, у партызанскую зону, у рукі “бацьку” Мінаю, падкошаны асабістым горам, партызанскі камандзір не мог да канца дачытаць твор».

3) У паэме паказана выключная таленавітасць мастака з народа, які пабудаваў выдатны храм, але размаляваў яго так, што біскуп і яго акружэнне пазналі сябе ў пачварных істотах.

АДКАЗ:

| № п/п | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |

**Заданне 9.** Знайдзіце ў кожным радзе "лішні" элемент. Абгрунтуйце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – 3 (0,5 – за правільна вызначаны "лішні" элемент; 1 – за абгрунтаванне кожнага выбару).*

1. "Марозны, звонкі вечар", "луг расой абмыўся", "светлыя згадкі", "простае шчасце людское".

Абгрунтаванне: ______________________

2. "Быкаўская" аповесць; "лейтэнанцкая", "франтавая", "акопная" проза; "інтэлектуальная" проза; "маленькая", "кароткая" аповесць.

Абгрунтаванне: ______________________

**Заданне 10.** Прачытайце верш. Пісьмова адкажыце на пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 6 (**2 балы** – за правільны адказ на кожнае пытанне).*

Я гіну ад бяздзейнасці не месяц,
Не два, не тры. Як быццам хто закляў!
Я сам сябе гатоў хутчэй павесіць,
Чым існаваць для непатрэбных спраў.
Запал прапаў – я сэрцам разумею,
Яго мне не пазычаць лекары.
Я вар'яцею, трацячы надзею,
І не чакаю лепшае пары.
Яна сама прыходзіць, як здароўе.
З крыніц сваіх і жыватворчых рэк
Прыносіць мне ....................................

*1960 г.*

**Пытанні і заданні да верша:**

1. Назавіце аўтара вышэйпрыведзенага верша. Пра якую новую паэтычную форму (від верша) паведаў сам паэт у апошнім радку?

2. Хто і што прывяло аўтара да стварэння новага віду верша? Абгрунтуйце свой адказ.

3. Якія падзеі тагачаснага грамадскага жыцця і творчай біяграфіі паэта адлюстраваны ў вершы?